# МАЙСТЭРСТВА ДЫЯЛОГУ

## Дэманструе арт-праект «Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока»

**30 мастакоў з 28 краін свету прадстаўляюць свае творы ў сэрцы Еўропы, у сэрцы Мінска, у Верхнім горадзе. Выстаўка «Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока», што працуе ў мастацкай галерэі народнага мастака СССР і Беларусі Міхаіла Савіцкага стала вынікам міжкультурнага дыялогу, у які ўключана наша краіна: да яе арганізацыі мелі дачыненне 28 пасольстваў Беларусі ў розных краінах. Такім чынам Мінск падцвярджае свой статус аб'яднаўчага горада.**

Гэта адзначыў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь **Уладзімір Макей, старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА:**

— Гэты маштабны праект пацвярджае ісціну пра ўніверсальнасць мастацтва і яго аб'яднаўчыя каштоўнасці. Мы можам разам шмат зрабіць для таго, каб наша Еўропа стала агульным і ўтульным домам. Сімвалічна, што Мінск стаў пляцоўкай для дыялогу ў розных эканамічных і палітычных пытаннях. Выстаўка надае новае вымярэнне гэтаму дыялогу — мастацкае.



Фота Вікторыі АСКЕРА.

Уладзімір МАКЕЙ адзначае Віктара Альшэўскага за працу па арганізацыі выстаўкі.

Ідэя выстаўкі нарадзілася год таму ў Лісабоне пры сустрэчы мастака Віктара Альшэўскага і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы Паўла Латушкі: абмяркоўвалі, што можна прапанаваць знакавага Беларусі ў Год культуры. Павел Латушка тлумачыць:

— Мы ўспомнілі тэзіс Шарля дэ Голя пра неабходнасць стварэння адзінай прасторы ад Лісабона да Урала без раздзяляльных ліній. Мы яго вырашылі трансфармаваць, зрабіўшы акцэнт на адсутнасці меж для мастацтва, прычым не толькі геаграфічных ці палітычных. Сучаснае мастацтва не абмежаванае ў форме, у ім безліч кірункаў, кожны з якіх мае права на існаванне. Таму мы вырашылі не ставіць ніякіх рамак пры арганізацыі выстаўкі, паказаць свет шырокім і розным. У гэтым праекце была толькі адна ўмова: аб'яднальнай краінай павінна была стаць Беларусь. Рэалізаваць задуму не атрымалася б без падтрымкі іншых міністэрстваў і маіх калег-дыпламатаў. Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Ірына Бокава ўпершыню прыняла патранат над выставачным праектам сучаснага мастацтва ў Беларусі. Ніколі Беларусь не збірала ў адной прасторы столькі мастакоў з розных краін. Нават прадстаўнікі маленькіх Манака і Андоры вельмі хацелі паказаць сваё мастацтва ў Мінску.

Адчуць пырскі мора ў Балгарыі дазваляе мастак Любен Генаў. Ёсць магчымасць убачыць сланечнікі вачыма мастачкі XXI стагоддзя Дорыт Клёмп з Нідэрландаў. Ці ўявіць агульную прастору дзякуючы Мары Росвальд з Эстоніі. Ці ўслед за немкай Зігфрыд фон Гунтэн задацца пытаннем, як выглядае «страчаная ідэнтычнасць»?.. Але і проста наталяцца паўнатой жыцця ўслед за Зурабам Цэрэтэлі, імя якога больш вядомае нашым гледачам, чым іншыя. Але ж тым больш адкрыццяў можна для сябе зрабіць.

9 удзельнікаў з розных краін прыехалі на адкрыццё выстаўкі ў Мінск. Мастак Луіш Радрыгіш з Партугаліі наогул адкрывае для сябе далёкую Беларусь. А некаторыя мелі асабістую зацікаўленасць, як Ульрых Уфрэхт: наша краіна цікавая для яго тым, што перажывае тыя ж змены, што і Заходні Берлін, які ён прадстаўляе. «Кандзінскі, Шагал...» — чуецца ў размове нямецкіх мастакоў. «Гэта Віцебск, Беларусь», — тлумачаць ім нашы наведвальнікі. Госці ківаюць — ведаюць. Нас пазнаюць праз мастацтва. Ёсць магчымасць пазнаць іншых: выстаўка будзе доўжыцца больш за месяц.

Падрабязней пра арт-праект «Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока» чытайце ў адным з наступных нумароў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*



На выстаўцы.

■ Кінакрокі

# Ці стаў Год культуры паспяховым для сферы кіно?

**Гэтыя дванаццаць месяцаў, якія ўжо амаль завершаны, па азначэнні павінны былі стаць асаблівымі для культуры, значыць, і для беларускага кінематографа. Але год — гэта толькі маленькі адрэзак часу, які ў нашых умовах не здольны прапанаваць кардынальныя перамены і глыбокія зрухі. Некалькі акцый, маштабных мерапрыемстваў, пафасных прамоў — і з 1 студзеня мы быццам не павінны працягваць гэту лінію. Па маіх адчуваннях, наш кінематограф у 2016 годзе, нават калі гэта быў Год культуры, не адчуў нейкіх імпульсаў і з моманту ўздыму маладога незалежнага кіно завіс у нявызначанасці: што будзе далей? І вось з гэтай туманнасцю, няяснасцю, цьмянасцю мы пераходзім у новы год, ад якога чакаем калі не прарываў, што было б добра, то хоць бы сціплых рухаў наперад. Таму што стан, у якім беларускае кіно знаходзіцца сёння, — вельмі кволы і нетрывалы, і мы з насцярожанасцю чакаем, куды гэты маятнік хістанецца. Уперад ці назад?**

Усё ж на працягу 2016-га сфера жыла, стварала кіно, паказвала яго на вялікім экране, ладзіла фестывалі, абмяркоўвала стужкі. З той нагоды, што ўжо праз тыдзень мы ў пэўным сэнсе «абнулім» мінулае і пачнём адлік наноў, варта падсумаваць вынікі гэтага кінематаграфічнага года — падзей і ініцыятыў, знакавых, сімвалічных і красамоўных.

**1.** Нягледзячы на тое, што ўжо некалькі гадоў, з 2012-га, у нас праводзіцца ў цэлым карэктная схема конкурсу кінапраектаў (гэта рэспубліканскі адкрыты конкурс кінапраектаў Міністэрства культуры), у краіне ён амаль не становіцца пачаткам вялікай гісторыі добрых фільмаў. Не трэба быць вельмі разумным, каб сказаць, што вынікі двух сёлетніх не будуць выключэннем. Чаго чакаць ад конкурсу, які ў катэгорыі ігравога кіно «заказвае» пяць серыялаў і ніводнага поўнаметражнага фільма (кінаверсіі апрыёры не ўлічваюцца), а тэмамі называе «дзейнасць сучасных абаронцаў Айчыны па гарантаванні нацыянальнай бяспекі» ці «фарміраванне пазітыўнага вобраза сучаснай Беларусі ў грамадска-сацыяльным кантэксце». Да таго ж кінастудыя «Беларусьфільм» толькі і зняла за гэты год (маю на ўвазе ігравое кіно), што фільм «Сляды на вадзе», які глядач убачыць на вялікім экране прыкладна ў сакавіку наступнага года. Праект «Трымайся за аблокі» (мы нават рабілі два рэпартажы са здымак карціны) пакуль прыпынены: ён павінен быў выйсці на экраны летам 2017 года, але ці будзе завершаны ўвогуле, пакуль невядома. Беларускія кінаведы сказалі, што матэрыял у здымачнай групы атрымаўся няякасным, што крыўдна — ізноў дзяржаўныя грошы рызыкуюць быць патрачанымі бессэнсоўна. Так і атрымліваецца, што на фестывальнае, дэбютнае, аўтарскае ці нават жанравае поўнаметражнае кіно сродкаў у нас не прадугледжана, а тое, што фінансуецца, часцяком аказваецца нізкасортным ці нават правальным.

> **Беларускі глядач нарэшце змог ацаніць не толькі рэдкія поўнаметражныя беларусьфільмаўскія карціны кшталту «Дзяржаўная граніца», але і новае жывое незалежнае кіно.**

**2.** У той жа час «неафіцыйны», калі карыстацца такімі тэрмінамі, кінематограф дае нагоды ім ганарыцца. У Беларусі ці беларусамі былі створаны фільмы, якія ўласна я рэкамендавала бы ўбачыць. Гэта незвычайная чорна-белая паўігравая, паўдакументальная «Саламанка» Руслана Фядотава і Аляксандры Кулак — беларусаў, што жывуць у Маскве, а фільм знялі ў мексіканскай рэлігійнай суполцы менанітаў. Гэта поўнаметражная дакументальная карціна Дзмітрыя Махамета, які жыве на дзве краіны — Беларусь і Францыю, з вельмі паэтычнай назвай «Ты сюды больш не вернешся, або Вецер ведае, што я дома». Гэта зноў жа дакументальная работа Андрэя Куцілы «25», у якой аўтар спрабуе адлюстраваць сучасную краіну праз пяць яе равеснікаў — маладых беларусаў. Гэта філігранная, знятая адным планам ігравая работа Віктара Красоўскага «Душы мёртвыя», дзе прыгожа абыграная адсылка да Гогаля, не застаецца ў адзіноце. Гэта тое, што магло быць паказаным у рамках Дзён беларускага кіно недзе за мяжой.

**3.** Беларускае кіно рэгулярна трапляе на вялікі экран, і гэта не толькі прадукцыя кінастудыі «Беларусьфільм». Так, былі паказаныя фільмы «Граф у апельсінах» Улады Сяньковай, «Відэарэгістратар» Філіпа Лагонды, «Гараш» Андрэя Курэйчыка і рыхтуецца да пракату «Party-Zan фільм» таго ж аўтара. З аднаго боку, шыкоўна, што сюды трапляе кіно, створанае без дапамогі дзяржавы, з іншага — пад канец года выбар кінапракату шчыра здзівіў, калі прапанаваў гледачу відавочна халтурную работу бізнесмена Яўгена Курэнчаніна «Розум».

Апроч гэтага, у рамках Года культуры міністэрства падтрымала ініцыятыву цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн» і Акадэміі мастацтваў паказаць падборку ігравых і дакументальных фільмаў беларускіх аўтараў у сталіцы і рэгіёнах у рамках акцыі «Новы погляд: маладое беларускае кіно». Сюды былі выбраныя фільмы «Госці» Андрэя Куцілы, «Подых балот» Ігара Чышчэні, «Амерыкан бой» Мікіты Лаўрэцкага, «Сапраўдная амерыканка» Дар'і Жук, «Фартуна» Івана Маслюкова і іншыя. Гэта значыць, што беларускі глядач нарэшце змог ацаніць не толькі рэдкія поўнаметражныя беларусьфільмаўскія карціны кшталту «Дзяржаўная граніца», але і новае жывое незалежнае кіно.

**4.** На беларускіх пляцоўках быў зладжаны шэраг кінафестываляў. Як непараўнальны міжнародны мінскі форум «Лістапад», так і фестываль выключна беларускага кіно «Бульбамувi», фестываль кароткаметражнага кіно Cinema PerpetuumMobile, фестываль кіно скандынаўскіх краін «Паўночнае ззянне», міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка» ў Магілёве і іншыя. Да таго ж 2016 год адзначаны вельмі прыгожай і прыемнай з'явай — кінапаказамі на беларускай мове. Займаюцца гэтым, праўда, не дзяржаўныя ўстановы, а грамадскія актывісты, тым не менш кожны жадаючы можа ўбачыць замежныя стужкі ў прафесійнай беларускамоўнай агучцы. За кампаніяй «Кінаконг» і яе кіраўніком Андрэем Кімам стаіць сайт з навінамі, трэйлерамі, рэцэнзіямі і іншымі адпаведнымі рэчамі на беларускай мове і кінапаказы ў кінатэатры «Перамога». Гэтыя паказы выклікалі да сябе такую цікавасць, што, напрыклад, мядзведзя «Падынгтана» прыйшлося дэманстраваць даўжэй.

> **Так і атрымліваецца, што на фестывальнае, дэбютнае, аўтарскае ці нават жанравае поўнаметражнае кіно сродкаў у нас не прадугледжана, а тое, што фінансуецца, часцяком аказваецца нізкасортным ці нават правальным.**

**5.** Рэканструкцыя «Беларусьфільма» працягваецца, а супрацоўнікі тым часам паказваюць, як пасля рамонту працякае столь. Не, не ў будаўнічых работах на нацыянальнай кінастудыі праблема нашага кінематографа. Яе не вырашыць толькі адміністрацыйнымі рашэннямі — у мастацтве так проста не бывае. Вядома ж, арганізацыя конкурсу, фінансаванне, індустрыя — усё павінна быць наладжана. Толькі мы занадта стаiранна на гэтым канцэнтруемся ў той час, як аўтарам не хапае больш важных рэчаў — кінематаграфічнага бачання, здольнасці аналізаваць наваколле, нагледжанасці, усведамлення сябе як аўтара, а не плагіятара, цвярозага агню ў вачах, а не любові да сферы кіно толькі з-за яе прадстаўнічасці. Усё гэта не магло ўзнікнуць за кароткі Год культуры, але гэтага часу было дастаткова, каб канчаткова ўпэўніцца: за ўсё пералічанае будзе адказваць незалежны кінематограф. І мы ўсе чакаем, што ён хістане гэта маятнік усё ж уперад.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*